***Спіс крыніц***

АВК – Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. Т. I–XXXIX. Вильна, 1885–1915; АЗР – Акты, относящиеся к истории Западной России. Т. I–V. СПб., 1846–1853; Апакр. – «Апакрысіс» (Вільня, 1598); Арыст. – «Арыстоцелевы вароты» (рукапіс НБ Беларусі, канец XVI ст.); Бельск. – «Хроніка» М. Бельскага (рукапіс РНБ, пачатак XVII ст.); Варл. – «Гісторыя аб Варлааме«» (Куцеін, 1637); Зб. 752 – Зборнік жыцій святых (рукапіс ДГМ, другая палавіна XVII ст.); КЗ – Литовская метрика. Книги записей // РИБ. Т. XXVII. СПб., 1910; Наб. тур. – «Аб набажэнстве турэцкім» (рукапіс ДГМ, канец XVI ст.); Пралог – «Пралог» (рукапіс РДБ XVII ст.); Скар. – «Біблія» выдання Ф. Скарыны: ДП – Кніга Данііла прарока; ІС – Кніга Ісуса Сірахава; КБ – Кніга Быцця; КІ – Кніга Іёва; Сматр. – «Казанне пахавальнае» М. Сматрыцкага (Вільня, 1620); Трыст. – «Аповесць аб Трыстане» (рукапіс Бібліятэкі імя Э. Рачынскага ў Познані, каля 1580 г.); Хран. – «Хранограф» (рукапіс РДБ, сярэдзіна XVII ст.); Чэцця – «Чэцця» 1489 г. (рукапіс НБ Украіны імя У. І. Вярнадскага).


# ДЭТЭКТЫВЫ «ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА» У. КАРАТКЕВІЧА І «САБАКА БАСКЕРВІЛЯЎ» А. КОНАН-ДОЙЛА: КАМПАРАТЫЎНЫ АСПЕКТ


*М. Г. Ясінская (Мінск, Беларусь)*



Праводзіцца кампаратыўны аналіз аповесцей У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» і А. Конан-Дойла «Сабака Баскервіляў». Характарызуюцца вобразы сышчыкаў Ш. Холмса і А. Беларэцкага, а таксама вобразы антаганістаў Стэплтана і Дубатоўка. Вылучаюцца адрозненне і падабенства ў змесце англійскага і беларускага дэтэктываў



**Ключавыя словы:** У. Караткевіч; А. Конан-Дойл; Андрэй Беларэцкі; Шэрлак Холмс; дэтэктыў.


Літаратурны жанр, які з захапленнем чытаюць людзі ва ўсім свеце, – гэта дэтэктыў. Таямнічасць, харызматычныя героі, вострая інтрыга, займальны сюжэт, нечаканая развязка нязменна прыцягваюць увагу чытацкай аўдыторыі. Згодна з вызначэннем В. Рагойшы, «дэтэктыўная літаратура (англ. detective – сышчык, ад лац. detection – раскрываць) – эпічныя і драматычныя творы, у якіх раскрываецца нейкая таямніца, звязаная са злачынствам. Заснавальнікам <…> лічыцца амерыканскі пісьменнік Э. По («Забойства на вуліцы Морг», 1841). <…> У. Караткевіч распачаў у нас жанр гістарычнага дэтэктыва («Дзікае паляванне караля Стаха», «Чорны замак Альшанскі»)» [4, с. 122].

Адзін з першых узораў айчыннага дэтэктыва – аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» – займае ў беларускай літаратуры вельмі важнае месца. Гэтая незвычайная гісторыя пра прывідных вершнікаў захоўвае адзначаныя характарыстыкі жанру і паводле следавання канону набліжаецца да аповесці А. Конан-Дойла «Сабака Баскервіляў». У аснову твораў пакладзены сямейныя легенды, «ажыўленыя» людзьмі дзеля ўласных мэт.

Героі легенд Раман Яноўскі і Гуга Баскервіль не зважалі на закон. Адчуваючы сваю беспакаранасць, яны здзяйснялі антыгуманныя ўчынкі, а жыццё чалавека для іх нічога не каштавала. У выніку абодва былі жорстка па-

караны. Але калі ў легендзе пра сабаку Баскервіля сцвярджаецца сусветны закон адплаты за свае ўчынкі, то ў гісторыі пра дзікае паляванне, акрамя гэтага, закранаюцца яшчэ палітычныя праблемы (барацьба беларускай шляхты за незалежнасць). Абедзве легенды, як дамоклаў меч, вісяць над галовамі Яноўскіх і Баскервіляў і зводзяць у магілу многіх.

Цікава, што дзеянне ў творах адбываецца на балотах: нішто так добра не схавае сакрэты, як дрыгва. Менавіта балоты і стануць месцам пакарання галоўных злодзееў. Так, і Дубатоўк, і містэр Стэплтан за свае злачынствы былі пахаваны ў багне.

| | |
|---|---|
| «Дзікі пошчак капытоў раздзёр ноч. Коні імчалі як шалёныя. <…> Бліжэй! Бліжэй! Адлегласць паміж Дубатоўкам і шалёнымі коньмі змяншалася. У адчаі ён збочыў са сцежкі, але звар'яцелыя коні збочылі таксама. <…><br>У той самы момант ногі ягоныя з маху ўскочылі ў бездань, а коні дагналі яго і пачалі правальвацца. Першы дрыкгант змяў яго капытамі, уціснуў глыбей у смярдзючую багну і загігатаў. Забулькацела, загаварыла дрыгва» [2, с. 247–248]. | «Если земля говорила правду, то Стэплтону так и не удалось добраться до своего убежища на островке, к которому он стремился в ту памятную нам туманную ночь. Этот холодный, жестокий человек был навеки погребен в самом сердце зловонной Гримпенской трясины, засосавшей его в свою бездонную глубину» [3]. |

Абедзве гісторыі чымсьці нагадваюць хорар (жахі). Наваколле Балотных Ялін і Баскервіль-Хола перакан ана ў рэальнасці страшных легенд і сямейных праклёнаў, што надае таямнічасці і напружанасці, стварае вусцішную атмасферу.

| | |
|---|---|
| «Цьмяныя цені коннікаў беглі ад дарогі наўскос да дрыгвяністай лагчыны. Веялі па ветры плашчы-велеісы, коннікі прама, як лялькі, сядзелі ў сядле, і ніводны гук не далятаў адтуль. Менавіта ў гэтым маўчанні і было самае жахлівае. Нейкія светлыя плямы выдзяляліся на гэтым туманным фоне. А дваццаць першы скакаў наперадзе, не матляючыся ў сядле, вочы яго закрываў нізка насунуты капялюх з пяром, твар быў змрочны і бледны, вусны падціснуты» [2, с. 125]. | «Это была собака, огромная, черная как смоль. Но такой собаки еще никто из нас, смертных, не видывал. Из ее отверстой пасти вырывалось пламя, глаза метали искры, по морде и загривку переливался мерцающий огонь. Ни в чьем воспаленном мозгу не могло бы возникнуть видение более страшное, более омерзительное, чем это адское существо, выскочившее на нас из тумана» [3]. |

Атмасферу таямнічасці ўзмацняе апісанне родавых замкаў – Балотных Ялін і Баскервіль-Хола. Змрочныя і непрытульныя, яны як бы забіраюць у сваіх гаспадароў жыццёвую энергію.

І англійскі, і беларускі творы да самага канца трымаюць чытача ў напружанні. Як гэта часцей за ўсё і бывае, галоўным антаганістам з'яўляецца герой, які, здаецца, так шчыра хвалюецца за лёс ахвяры. А ўсё дзеля грошай. Грошы могуць зрабіць з чалавека самага страшнага звера. Дубатоўк і містэр Стэплтан на сваім шляху да ўзбагачэння нікога не шкадавалі. Можна толькі падзівіцца, як гэтыя злодзеі па-майстэрску выкарысталі легенды для ўласных мэт. Антаганісты цудоўна вывучылі план мясцовасці

і пралажылі шлях праз балоты. Дрыгва і туман толькі дапамагалі ствараць эфект нерэальнасці падзей. Злодзеі так дасканала падрыхтавалі свае злачынствы, што зразумела, чаму не толькі простыя жыхары ваколіц Балотных Ялін і Баскервіль-Хола, але і больш адукаваныя людзі ўспрымалі дзікае паляванне і сабаку Баскервіляў як сапраўдных зданяў. Ды толькі інтарэсы Дубатоўка былі куды больш глабальныя, чым у Стэплтана, а ў здзяйсненні плана гэтаму герою дапамагала яшчэ і шляхта. Прывідныя вершнікі трымалі ў страху і падпарадкаванні мясцовых сялян, што і было адной з галоўных задач палявання: «І яшчэ: мы заўжды выязджалі на паляванне толькі ўночы, калі туман паўзе па зямлі. І ўсе таму лічылі нас прывідамі. А мы яшчэ і маўчалі заўжды. Гэта была рызыка. Але што ж нам было рабіць, падыхаць з голаду на чвэрці валокі? А Дубатоўк плаціў. І, да таго ж, мы не толькі даводзілі гэтым да вар'яцтва або смерці Яноўскую, мы яшчэ і вучылі нахабных хлопаў, каб ведалі жах божы і не думалі пра сябе занадта многа» [2, с. 234].

Увогуле калі «Сабака Баскервіляў» не выходзіць за межы звычайнага дэтэктыва, то ў «Дзікім паляванні…» акрамя дэтэктыўнай гісторыі паказана яшчэ і трагедыя беларускага народа. Як зазначае А. Верабей, «аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» толькі знешне падобна да твора Конан-Дойла. Выкарыстаўшы законы і прыёмы дэтэктыўнага жанру, У. Караткевіч здолеў паказаць беларускае грамадства 80-х гадоў XIX ст. у яго гістарычнай, культурнай і нацыянальнай спецыфіцы» [1, с. 88]. І з гэтым нельга не пагадзіцца, бо шляхта, знаходзячыся ў такім жа матэрыяльным становішчы, як і сяляне, пачынае рабіць бесчалавечныя ўчынкі. Дзікае паляванне забівае ўсіх, хто спрабуе супраціўляцца, а падкупленыя мясцовыя ўлады заплюшчваюць на гэта вочы. У беларускім творы паказана абыякавасць паліцыі да забойстваў і ўсіх тых жахаў, якія рабіліся ў Балотных Ялінах.

Але ў Балотныя Яліны аднойчы выпадкова трапляе Андрэй Беларэцкі, фалькларыст і этнограф. Ён вырашае дапамагчы Надзеі Яноўскай пазбавіцца мясцовых зданяў. Сышчык па вострай неабходнасці, а не па роду дзейнасці, Беларэцкі па кроплі збірае патрэбныя звесткі. Нават пагроза жыццю не адбірае жадання дакапацца да ісціны. Герой не прапускае ні адной дэталі. Так, дзякуючы сваёй назіральнасці, ён выкрывае таямніцу Малога Чалавека. «Рука... адкуль рука. Ага! У Малога Чалавека, калі ён глядзеў на мяне праз акно, была рука, як у Бермана, такія самыя доўгія нялюдскія пальцы» [2, с. 207].

Беларэцкі ўмее знаходзіць сяброў. У гэтым вельмі дапамагае яго прафесія. Ён добра разумее быт сялян і шчыра спачувае ім. Прастатой абыходжання ён змог заваяваць прыхільнасць мясцовых жыхароў. Увогуле ў расследаванні Андрэю дапамагалі Свеціловіч, Рыгор і сяляне, якім таксама не давала жыцця дзікае паляванне. Цікава, што Беларэцкі не хацеў забіваць усіх прывідных вершнікаў, але «хлопы» вырашылі, што іх паны за свае ўчынкі літасці не заслужылі.

У адрозненне ад Беларэцкага Шэрлак Холмс расследаваннямі зарабляе сабе на жыццё. Да яго за дапамогай звяртаюцца англійскія арыстакраты,

звычайныя людзі і нават паліцыя Скотланд-Ярда. Але галоўнае для дэтэктыва не грошы, а сам працэс працы. Беручыся за новую загадку, ён забывае на ўсё астатняе. Асаблівую ўвагу Холмс, як і Беларэцкі, надае дробным дэталям: «Чем нелепее и грубее кажется вам какая-нибудь деталь, тем большего внимания она заслуживает. Те обстоятельства, которые на первый взгляд лишь усложняют дело, чаще всего приводят вас к разгадке» [3].

Шэрлак Холмс мае вельмі шырокія веды ў галіне расследаванняў. Адразу відаць, што працай дэтэктыва ён займаецца прафесійна. Так, герой ведае амаль усе шрыфты лонданскіх газет. Разам з тым ён абыякавы да пытання, ці Сонца рухаецца вакол Зямлі, ці Зямля вакол Сонца.

Шэрлак Холмс часцей за ўсё працуе адзін, але часам яму дапамагаюць доктар Уотсан альбо паліцыя. Аднак усе вывады па справе дэтэктыў робіць сам. Працаваць з Шэрлакам – справа няпростая, бо ён не заўсёды тлумачыць свае дзеянні: «Одним из недостатков Шерлока Холмса – если только это можно назвать недостатком – было то, что он никогда и ни с кем не делился своими планами вплоть до их свершения. Такая скрытность объяснялась отчасти властной натурой этого человека, любившего повелевать окружающими и поражать их воображение, отчасти профессиональной осторожностью, не позволявшей ему рисковать без нужды» [3]. Напрыклад, ён не папярэдзіў свайго сябра Уотсана, што таксама паедзе ў Баскервіль-Хол, але гэта было зроблена для таго, каб не спужаць злачынцу.

Аповесці У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» і А. Конан-Дойла «Сабака Баскервіляў» з'яўляюцца яркімі ўзорамі дэтэктыва. У абодвух творах захоўваюцца жанравыя характарыстыкі (таямнічасць, харызматычныя героі, вострая інтрыга, займальны сюжэт, нечаканая развязка); выключную ролю выконвае герой-сышчык; дзеянне звязана з родавым праклятцем, разгортваецца на фоне замкаў і балот, надаючы тэкстам адзнакі гісторыі жахаў.

### *Бібліяграфічны спіс*


1. Верабей, А. Л. Жывая повязь часоў : нарыс творчасці Уладзіміра Караткевіча / А. Л. Верабей. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 119 с.
2. Караткевіч, У. Дзікае паляванне караля Стаха : аповесць ; Зямля пад белымі крыламі : нарыс : для ст. шк. узросту / У. Караткевіч ; прадм. А. Расінскага. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 493 с.
3. Конан Дойл, А. Собака Баскервилей [Электронный ресурс] / А. Конан Дойл // Lib.Ru: Библиотека Максима Мошкова. – Режим доступа: http://lib.ru/AKONANDOJL/sh_baskr.txt_with-big-pictures.html. – Дата доступа: 19.08.2021.
4. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В. Рагойша. – Мінск : Беларус. Энц., 2001. – 384 с.